Год II. Пятніца, 11 сакавіка (марца) 1921 г. № 10.

НАША ДУМКА

Палітычная, экономічная і літэратурная тыднёвая газэта

ПАДПІСКА: на 3 месяцы 75 марак або 5 ф. мукі. Цана асоб. нумэру 6 марак. Адрэс: Вільня, Вострабрамская 5 (Пасаж).

Усіх паважаных рэдактароу, якім пасылаецца „Наша Думка“ з напісам „абмен“, вельмі просім высылаць і нам свае выданьні.

Ні Сойм, ні плебісцыт...

Віленская справа ўступіла ў новую фазу... Каторую? Дапраўды, трудна сказаць. Якога характару гэтая фаза? Проста кажучы, — новага, яшчэ не прабаванага.

Пасьля спроб тым ці іншым спосабам скончыць з Віленскім пытаньнем, спроб выхадзіўшых з розных бакоў і ня даўшых дагэтуль добрых вынікаў, спорка з-за Вільні і Віленшчыны перайшла на новы грунт. Ліга Народаў запрапанавала Ліцьве і Польшчы ўступіць у перагаворы, не беспасрэдныя, каторыя ужо вяліся паміж Польшчай і Літвой і не далі ніякіх добрых рэзультатаў, а пры пасрэдніцтве прадстаўніка ад Лігі Народаў п. Гюісманса, бяльгійскага міністра заграніčных спраў. Перагаворы будуць адбывацца ў Брусэлі, куды не пазьней як праз месяц павінны будуць прыехаць дэлегацыі абедзьвюх старон, змагаючыхся за Вільню і Віленшчыну, а можа і ня толькі за гэтыя абшары літоўска-беларускіх земель.

Як мы бачылі і бачым, ні адзін з спасобоў развязаньня Віленскага пытаньня ня даў дагэтуль ніякіх рэзультатаў.

„Узбунтаваныя“ польскія войскі і „Тымчасовая Урадуючая Камісія“ стаялі за Сойм ў Вільні, каторы павінен быў-бы, па зданьню папіраўшых яго польскіх палітычных кругоў, насупроць палітычных кругоў іншых нацыянальнасьцяў, сказаць, як быць з Віленшчынай.

Акцыя гэта, не знайшоўшая ў канцы канцоў афіцыяльнага падтрыманьня збоку Польшчы, спынена была самымі пачынальнікамі яе, пасьля чаго Ліга Народаў праклямавала плебісцыт.

Гэтымі днямі скончыліся нарады Лігі Народаў па польска-літоўскаму конфліту. Гаварылі аб плебісцыту і... амаль да нічога на дагаварыліся. З ня зусім поўных і ясных справаздач тутэйшай і варшаўскай прэсы відаць, што Польшча і Літва у прынцыпе згаджаюцца на плебісцыт, але расходзяцца у спосабе, тэрміне і месцу плебісцыту.

Польшча кажа, што плебісцыт павінен адбыцца ў найхутчэйшым тэрміне, Літва стаіць за тэрмін больш-менш позьні.

Польшча хоча, каб плебісцыт адбыўся ў Вільні і Віленшчыне, Літва зусім выключае Вільню і значную частку Віленшчыны з плебісцытнай тэрыторыі.

Польшча хацела плебісцыту двухступеннага, г. ё. каб адбыліся выбары прадстаўнікоў, каторыя і павінны былі-б падаць голас ці за Літву, ці за Польшчу. Літва стаіць за беспасрэднае галасаваньне.

Як можна лёгка зразумець, розьніца ў становішчах змагаючыхся старон вялікая, не даючая падставін для скорай згоды. А калі няма згоды, то плебісцыту быць ня можа.

Будуць польска-літоўскія перагаворы, пры пасрэдніцтве Лігі Народаў. Думаецца, што і там правіцца непрымірымасьць абедзьвюх старон, бо што такое пасрэдніцтва, без абавязковасьці для аднэй і другой стараны падлягаць компэтэнцыі пасрэдніка, дэцызію якога можна будзе адкінуць.

Зусім іншае што—арбітраж, прапазіцыю аб чым ўнёс літоўскі дэлегат, але на яе ня згодзіўся польскі дэлегат. Арбітраж—гэта суд, пастанове каторага абедзьве староны даюць слова не працівіцца.

Ітак, мы бачым, што пакуль-што Віленская справа не паддаецца вырашэньню ніякім спосабам, які-б хто, гдзе і калі ні прыдумаў. А калі так, то прыходзіцца чакаць... зьмены утварыўшайся палітычнай сітуацыі...

Вось скора прыгрэе сонца, растае сьнег, ажыве прырода, закапашацца мурашкі і людзі... Разам з тым адбудзецца плебісцыт у Горнай Сілезіі і скончыцца чым-небудзь (але чым?) нескончальныя Рыжскія перагаворы.

Пацярпім, пачакаем...

Вілянчук.

Нарады соцыялістаў аб нашым краю.

Справы нацыянальных адносін на першы пагляд гэткія заблутаныя—разьвязваюцца зусім лёгка і згодна, калі да іх разьвязкі будзем падходзіць стоючы на грунце ш ч ы р а г а дэмакратызму. На такім грунце заўсёды стаялі і стаяць перш за ўсё с о ц ы я л і с т ы ч н ы я п а р т ы і.

Вось, мы і вітаем спробу літоўскіх соцыял-дэмакратаў разьвязаць заблутаны вузел нацыянальных адносін у нашай бацькаўшчыне, дайшоўшы згоды соцыялістычных элемэнтаў усіх нацыянальнасьцей краю. Бо калі ўжо соцыялісты не здалеюць гаварыць супольным языком, дык чаго-ж ждаць ад наскрозь нацыяналістычнае буржуазіі?

Трэба адзначыць, што дагэтуль толькі тры краёвыя соцыялістычныя групы ў справах нашае супольнае будучыны выступалі разам, салідарна: беларуская, літоўская і—часьцю—жыдоўская. Цяпер прыехаўшы з Коўны член літоўскага ўстаноўчага сойму, член літ. с.-д. партыі, тав. Вэнслаўскі запрасіў на нараду беларускіх і польскіх соцыялістаў, якая адбывалася 25 і 26 лютага.

На нараду з ліцьвінамі прыбылі прадстаўнікі беларускіх соц.-дэм. і соц.-рэв. і прадстаўнікі партыі польскіх соцыялістаў Беларусі і Літвы. Абмен думкамі абняў тры пытаньні: аб тым, як глядзець на землі, адыйшоўшыя ад Расеі паводле расейска-літоўскае і расейска-польскае міравых умоў; аб унутраным устройстве гэтых зямель; аб адносінах іх да суседзяў—спэцыяльна да Польшчы. На фоне гэтых гутарак і выявілася ўсё тое, што ёсьць супольнага і ў чым ня годзяцца між сабой беларускія, літоўскія і польскія соцыялісты.

У першых двух пытаньнях зыйшліся ўсе на адным: 1) што землі, якія адпалі ад Расеі па мопы прэлімінарнае польска-расейскае умовы ў Рызе і на моцы літоўска-расейскага міру і якія ляжаць на ўсход ад Буга і Нарова, становяць край з зусім асаблівым, індывідуальным характарам, а дзеля гэтага ня могуць быць ані дзелены на часткі, ані прылучаны да Польшчы. Ні ўмова польска-бальшавіцкая, ні літоўска-бальшавіцкая ня могуць быць прызнаны законнымі, бо яны патапталі асноўны прынцып дэмакратызму: патапталі волю насяленьня гэтых зямель, судзячы аб яго долі без яго. 2) што гэты край, прымаючы пад увагу немагчымасьць ужо цяпер разьвязаць пытаньне аб долі другіх беларускіх зямель, павінен разам з этнаграфічнай Літвой ставіць незалежнае і сувэрэннае дэмакратычнае гаспадарства, ў каторым унутраны лад мае быць абаперты на прынцыпе як найшырэйшай дэцэнтралізацыі (эвэнтуальна ў постаці кантонаў). Выявілася і поўная згодлівасьць у паглядзе на характар гэтых кантонаў: яны ня могуць быць напыянальнымі (асобне беларускі, асобне літоўскі і асобне польскі), бо няма такіх тэрыторый, дзе жыла-бы выключна адна з гэтых трох нацыянальнасьцяў,—а павінны быць тэрыторыяльнымі з роўнымі правамі для ўсіх нацыянальнасьцяў (напр.: Ковенскі кантон—літоўска-польска-жыдоўскі, Віленска-Горадзенска-Баранавіцкі кантон—беларуска-польска-жыдоўскі).

Ніякіх рэзалюцый нарада не ўхваліла, і мы падаем толькі зьмест тых думак, якія былі згодна выказаны прадстаўнікамі беларускіх, літоўскіх і польскіх соцыялістаў. Гэта—датычна першых двух пунктаў нарады. Але, калі пачалася гутарка аб трэйцім пунксе, дык тут думкі разыйшліся. Беларусы і Ліцьвіны, стоючы на ч ы с т а с о ц ы я л і с т ы ч н ы м становішчы: на становішчы інтарэсаў работнікаў і працоўнага сялянства, даводзілі, што аб ф э д э р а ц ы і з ц я п е р а ш н я й Польшчай ня можа быць і гутаркі. Асабліва-ж страшна для насяленьня нашага краю ўсіх нацыянальнасьцяў—у тым ліку і польскіх работнікаў і сялян—простае прылучэньне да Польшчы: Вільня, цяперашняя сталіца краю, абярнулася-бы у звычайны губэрскі („ваяводзкі“) горад, як якісь Каліш, ці Ломжа, а прамышленнасьць яго, адрэзаная ад Літвы эонаграфічнай і ад усходня-беларускіх зямель, зусім падупала-бы, прымушаючы тутэйшы работніцкі пролетарыят шукаць працы па ўсім сьвеце; а для сялянства прапала-бы ўсялякая магчымасьць здабыць зямлю, бо яе польскі сойм у Варшаве ўжо пастанавіў у першы чарод падзяліць між бышымі польскімі салдатамі.

Польскія соцыялісты на гэта не згаджаліся. Але пры гэтым вытлумачылі, што сваё становішча ў справе адносін да Польшчы (фэдэрацыя гэтага краю і Літвы этнаграфічнай з Польшчай, а калі Літва ня згодзіцца—дык простая інкорпорацыя да Польшчы) польскія соцыялісты занялі пад уплывам выпадкаў (выступленьне ген. Жэлігоўскага) і гатовы перагледзець.

Беларусы і ліцьвіны запрапанавалі палякам такую плятформу ў справе адносін да цяперашней Польшчы: „Кіруючыся прынцыпова да фэдэрацыі з суседнімі дэ м а к р а т ы ч н ы м і дзяржавамі, мы лічым, што завязаньне фэдэрацыйнае сувязі з тым або іншым суседам належыць да компэтэнцыі агульна-краёвага ўстаноўчага сойму і толькі ў ім можа быць аканчальна пастаноўлена.“ П. П. С. дагэтуль новага становішча ў гэтай справе ня выпрацавала.

Вельмі шкада, што з прычын тэхнічнага характару не ўдалося запрасіць на гэту нараду жыдоўскіх соцыялістаў. Гэта магло-бы шмат даноўніць нараду і, мы спадзяемся, што, калі-б нарада на гэтым ня спынілася, ў будучыне ў ей прымуць учасьце і прадстаўнікі жыдоў.

А. Л.

Дзьве праграмы.

Нядаўна адбыліся перагаворы прадстаўнікоў літоўскіх і польскіх грамадзкіх кругоў, на якіх абедзьве староны абмяняліся паміж сабою сваімі праграмнымі дэкляарацыямі.

Ліцьвіны на гэтых перагаворах былі прадстоўлены народнымі соцыялістамі-дэмакратамі і „Сялянскім Саюзам“, а палякі—саюзам „Адраджэньне“.

Асобна ішлі перагаворы паміж прадстаўнікамі „Польскай Соцыялістычнай Партыі Літвы і Беларусі“ (P. P. S.) і прадстаўніком „Соцыяль - дэмакрацыі Літвы“ п. Вэнслаўскім.

Беларусы так сама мелі некалькі спатканьняў з прадстаўнікамі літоўскай дэлегацыі.

У канцы гэтых перагавораў выявіліся праграмы абедзьвюх (польскай і літоўскай) старон, з якіх відно, як мысьляць сабе магчымым разьвязаньне польска-літоўскага конфлікту адна і другая старана.

Праграмы гэтыя трактуюць тры пытаньні:

I. Граніцы Літвы.
II. Унутранае ўстройства яе і
III. Адносіны да Польшчы.

Па пытаньню аб граніцах абедзьве стораны больш-менш зышліся на тым, што да Літвы павінны-б былі адыйсьці тэрыторыі: на поўначы і усходзе—да лініі польска-бальшавіцкага (Рыжскага) міру; на поўдні—па рэчцы Шчары і Нёману. Палякі ня згодзіліся толькі аддаць ліцьвінам Горадні.

Усё, здавалася, было-б добра, каб ні адна „маленачкая“ прашкода.

Палякі зажадалі фэдэрацыі Літвы з Польшчай, а калі не,—то вышэй азначаныя граніцы касуюцца і Віленшчына адыходзіць да Польшчы. Аднак, калі-б Літва згодзілася на фэдэрацыю з Польшчай і, значыцца, атрымала-б указаныя вышэй граніцы, то яна павінна-б была быць разьдзелена на два кантоны: Віленскі і Ковенскі з сваімі асобнымі Соймамі і Урадамі. Пытаньні, агульныя для абодвух кантонаў, рашаюцца дэлегацыямі Віленскага і Ковенскага Соймаў і зьдзейсьніваюцца агульным для абодвух кантонаў Урадам, прабываючым у Вільні.

Літоўскія праграмныя прапазіцыі адкідаюць у корані усялякія думкі аб фэдэрацыі с кім-бы та ні было, хоць-бы і з Польшчай.

Зусім слушна ліцьвіны кажуць, што адносіны Літвы да Польшчы зьяўляюцца адносінамі сувэрэннага Літоўскага гаспадарства да сувэрэннага гаспадарства Польскага.

Гэтым пунктам заложан цьвёрды фундамэнт літоўскай дзяржавы. Што-ж была-б гэта за дзяржава, котор ая з першых-жа сваіх дзён расьпісалася-бы ў сваёй залежнасьці? Бо што ні гаварыце, як ні старайцеся „даказаць“, што тут ідзе рэч аб „роўных з роўнымі і вольных з вольнымі“, але „niema glupich“, — кожны добра разумее гэты дэвіз старой шляхты, которы для ліцьвіноў і беларусаў заўсёды заканчываўся „фокусамі“ Люблінскай Уніі і яе далейных вынікаў.

Мы хочам быць самымі сабой, мы—ліцьвіны і беларусы—мужыцкае племя—хочам быць роўнымі паміж сабой і панаваць пад „панамі“—здраднікамі нашае бацькаўшчыны, каторыя цягнуць насупроць нам і на карысьць сваім інтарэсам.

З нашага мужыцкага пагляду дзяленьне Літвы на кантоны Ковенскі і Віленскі скрывае пад сабоў чыста панскую інтрыгу, бо усім ведама, што у Ліцьве праводзіцца ў жыцьцё зямельны закон, которы няшчадна моцна б'ець па „панох“ і іх абшарніцкіх інтарэсах, і што розныя абшарніцкія польскія арганізацыі у Вільні шукаюць толькі зачэпак, каб кінуцца на ковенскіх літоўскіх „мужыкоў“.

Пазіцыя „Адраджэньня“—ёсьць компроміс паміж „панам і мужыком“ нашага краю, распрагандованым у крунку „далучэньня“ да Польшчы і „адабраньня зямлі за выкуп“.

Хомінскія, Кржыжаноўскія, Міцкевічы—гэта ўсё—„мяшчане“ нашых дзён, каторым хочацца „эвалюцыі“ не ў агуль-

на-соцыяльных пытаньнях, а ў сваіх асабістых, каб як-небудзь самім выйсьці з сучаснага пекла сухімі.

Для іх асабістых мэтаў патрэбны і кантоны, бо яны даюць ім магчымасьць калі не ўратавацца ад літоўскай „анэксыі“, то хоць аддаліць гэту анэксыю. Не, паночкі, не марнуйце сіл і сваіх і чужых!

Скажам ясна: беларусам па дарозе з тымі, хто нясе з сабой ясную праграму па зямельнаму пытаньню, хто аддае зямлю працоўнаму народу, будзь ён беларус, ліцьвін, паляк, ці другі „тутэйшы“. А ўсе гэтыя кантоны з іх выкрутасамі і гэтым дзіўным „адраджэнскім“ запахам „польскосьці зямі Віленскай“, у каторай з давён даўна жылі і жывуць ліцьвіны і беларусы, спаланізаваныя — кім?—як не абшарнікамі чужэй нацыі,— усё гэта нам не па сэрцу.

Не, мы баімося „колёнізацыі“ нашай зямлі чужымі людзьмі, мы баімося і ўплываў у гэтай справе на Віленшчыну польскага сойму і польскай палітыкі, наагул, каторай вельмі ходзіць аб тое, каб „вольныя“ землі нашай бацькаўшчыны аддаць „сваім“ людзём, главным чынам жаўнерам польскай арміі.

З розных гэтых прычын мы будзем заўсёды з тымі, хто вядзе такую палітыку, якая ня можа нікога і нічым уціскаць, будзь то пытаньне аб зямлі, аб роднай мове, аб аўтаноміі пэрсональнай, тэрытарыяльнай і іншых рэчах. Свой з сваім заўсёды знойдзе грунт і паразумеецца. Але за тое „гусь сьвіньні не таварыш“,—куды-ж нам беларуска-літоўскім мужыком лезьці у панскую кумпанію з адраджэнцкай панска-мяшчанскай палітыкаю?

Усім так-сама ведама, што „Адраджэньне“ і навет яшчэ больш левыя польскія групы кажуць, што Віленскі кантон амаль зусім польскі, што ў Віленшчыне палякі становяць большасьць, а іншыя народнасьці—меншасьць.

Можна запытацца, на што-ж тады адрываць гэтую частку польскай зямлі ад Польшчы і звязваць яе з Літвой? У гэтым пункце праграмы „адраджэнцаў“ можна відзець замаскіраваную тэндэнцыю тых-жа „далучэнцаў“, каторым ходзіць аб далучэньні Віленшчыны да Польшчы спосабам анэксіі, тады як „адраджэнцы“ і іх левыя таварышы хочуць зробіць тую самую работу навакольнымі дарогамі, паволі, мягчэй.

Няма чаго казаць, што ні ліцьвіны, ні беларусы, ні жыды ня пойдуць гэтаю дарогаю на сваю пагібель.

Р—ц.

Патрэба арганізацыі парабкаў.

На пятым зьезьдзе прафэсыянальнага саюзу дворных парабкаў Польшчы, які гэтымі днямі адбыўся ў Варшаве, прынята пастанова абвесьціць на 14 марца агульную забастоўку ўсіх дворных парабкаў. Зьезд высказаў пэўнасьць, што ў гэты дзень сто сорак тысяч парабкаў Польшчы кінуць сваю работу, каб гэткім спосабам прымусіць сваіх паноў споўніць дамаганьні парабкаў. Барацьба, якая узьнялася паміж польскімі сельска-гаспадарскімі работнікамі-наймітамі і зямляўласьнікамі, павінна гулкім эхам адбіцца і ў нас. Праўда, што ў нас іх шмат менш, чымся ў Польшчы: ў нас большасьць наймітаў у двары маюць хоць маленачкі шматочак зямлі і усё шчасьце сваё бачаць у павялічаньне свае ўласнасьці. Дык-жа маем мы і безьзямельнікаў, а і малазямельныя—пакуль мы ня збудуем сваей незалежнай дзяржавы з сялянска-работніцкім урадам — ня могуць мець надзеі на зямлю. Вось-жа ў тэй самай Польшчы, хоць тамака ў сойме многа сялян, хоць сялянскі сын, Вітос, стаіць на чале ўраду, дык-жа паны маюць яшчэ гэткую сілу, што ухваленай Соймам зямельнай рэформы ані руш з мёртвага пункту скрануць нельга!

З гэтага ясна, што яшчэ доўгі час дворныя найміты прымушаны будуць мадзець на панскай службе, ня бачучы тае жаданае зямліцы. З гэтага ясна таксама, што ім нельга спадзявацца на зямлю, а трэба—не аглдаючыся адно толькі на няпэўны заўтрашні дзень здабываць ужо сягоньня ўсё лепшыя варункі працы ад двара, трэба дзеля гэтага так сама арганізавацца ў саюз, як дворныя парабкі ў Польшчы.

Паўгоду таму назад мы бачылі ў Вільні спробу стварыць гэткую парабчанскую арганізацыю—прафэсыянальны саюз сельска - гаспадарскіх работнікаў. Саюз, праўда, заклаўся, ды неяк ён мала выяўляе сваю дзейнасьць Прычын гэтаму, — многа, а ў першы чарод тое, што мы ўсё яшчэ перажываем ненармальны стан, што няма акуратных зносін з правінцыяй, няма ніякага забасьпечаньня свабоды арганізацыі; другое-ж — гэта ўчасьце ў пачатковых закладзінах саюзу элемэнтаў для нас і нашага краю чужых, наездных, меўшых на мэце выкарыстаць парабчанскія сілы не дзеля барацьбы за лепшыя варункі працы (тады ніводнага пана тут ня было!), а дзеля сваіх палітычных мэт.

Лічучы нязвычайна важнай справу арганізацыі нашых сельска-гаспадарскіх работнікаў-наймітаў, мы зварочваем увагу тых, хто стаіць на чале істнуючага ўжо саюзу, на патрэбу паставіць усю працу саюзу на чыста прафэсыянальным і клясовым грунце, зрокшыся ўсялякае палітыкі. І тады праца саюзу зрушыцца з мёртвага месца, на якім затрымалася.

Грамадзянін.

Па разбураных мясцох Беларусі.

(Гл. № 9).

Як сьледства нявыказана цяжкіх умоў жыцьця, прадаўжае вырываць у розных сем'яў свае ахвяры тыфус, пры адсутнасьці на месцы якой-бы то ні было дахторскае падмогі.

Прыходзіцца сказаць, што паварочаныя на родныя месцы уцекачы прадастаўлены самім сабе, ня маючы ні медыцынскае помачы, ні школ, ні срэдстваў на адбудову гаспадаркі. Праўда, дзе-нядзе школы адчыняюць, але польскія з выкладаньнем на польскай мове. Гэта пры беларускім насяленьні, жывучым скрозь і няведаючым польскае мовы!

Акалічнасьці вымагалі ад мяне быць у Нарве. Гэта мястэчка, якое знаходзіцца за 20 вёрст ад Бельска. Па дарозе знаходзяцца в. в. Сакі, Піліпкі, Кленікі, Ціневічы. Усе яны пацярпелі ад вайны. Сакі пагарэлі на палавіну. Піліпкі і суседняя вёска Трашчоткі зусім зьніштожаны. Толькі дзе-нядзе захавалася садовыя дрэвы і паказваюць, што тут былі вёскі. У Піліпках некалькі вярнуўшыхся уцекачоў пачалі будавацца. Калісь багатая вёска Кленікі болей чым на палавіну згарэла. Сяло Пасынкі зьніштожана на ²/₃. Ціневічы, раўнуючы, пацярпелі меней, але хаты бяз вокан і дзьвярэй—знак, што іх ранейшыя жыхары яшчэ не вярнуліся.

Праяжджаючы затым з Нарвы ў Беласток, прыйшлося на кароткі час застанавіцца ў с. Трасьцянцы. І тут той-жа абраз разбурэньня. Драўляныя будынкі зусім зьнішчаны, ад мурававых захаваліся толькі сьцены. Быўшы будынак настаўніцкае сэмінарыі стаіць з праваленаю страхою і забітымі вокнамі.

Ворнае поле тут густа зарасло бярэзьнікам і альшэўнікам, і шмат прыдзецца пакласьці тут працы земляробу, каб зрабіць яго ізноў такім, якое было раней.

З заросшымі сенажацямі справа лягчэйшая. Іх проста ў восень запаліваюць. Наросшая ў працягу некалькіх гадоў сухая трава надта добра гарыць і разам з ёю зьніштажаюцца маладыя кусты.

Мне пераказывалі, што ў мінуўшую восень такім чынам былі ачышчаны ўсе сенажаці на рацэ Белай: Зарава ад гарэўшых лугоў было відно некалькі дзён на дзесяткі вёрст кругом.

І тут у Трасьцянцы гэтак-жа, як і ў Катлох, паварочаныя гаруюць, ня маючы ні жывога, ні мёртвага інвентару, ні харчоў. Усюды бачыш разбурэньне, бачыш галодных і голых людзей і адсутнасьць якое-б то ня было падмогі з боку

Бачаны мною абраз разбурэньня й бяды паварочаных бяжэнцаў у Бельскім павеце заўважваецца ў большай часьці Гродзеншчыны. Паветы Брэстскі, Слонімскі, Пружанскі, Ваўкавыскі зусім спустошаны. Як выключэньне, можна спаткаць тут уцалеўшую вёску, але й яна болей чым на палавіну пустая, бо вельмі многія з яе ранейшых жыхароў да гэтага часу яшчэ ніяк ня могуць вырвацца з Расеі.

Я бачыў у Самары уцекачоў з гэтых паветаў. Бачыў іх у сайраках на Палявой вуліцы. Двух'ярусныя палаткі; сьпёртае цяжкое паветра; сьпяць у павалку. Пошасьць тыфуса тут амаль ніволі ня выводзіцца.

Ува ўсіх адна думка, адно жаданьне—гэта скарэй вярнуцца на бацькаўшчыну.

З усіх старонак сьвета найболей папярпеўшаю ад сусьветнае вайны аказалася Беларусь. Насяленьне Бельгіі й Сэрбіі ўжо трэці год, як ізноў жыве на сваіх родных мясцох і дзякуючы падмозе, якую робяць яму з усіх бакоў, ізноў зажыло даўнейшым жыцьцем.

Польшча, Літва, Лацьвія, хоць і вельмі пацярпелі ад вайны, але далёка не ў такой меры, як Заходняя Беларусь. Латыш, паляк, ліцьвін, зьвярнуўшыся на бацькаўшчыну, знаходзіць тут і матар'яльную й духоўную падмогу. Яго сям'я не галадае, яго дзеці вучацца ў школе. Толькі беларус, вярнуўшыся на роднае папялішча, вярнушыся старцам (жабраком), пакідаецца бяз усякае падмогі, каб потым прапасьці ад голаду й пошасьці. Мала таго; як раней застаўлялі яго забыцца сваю родную мову, так і цяпер ад яго вымагаюць, каб ён і яго дзеці гаварылі на чужой для яго мове. Розьніца толькі ў тым, што раней гэта рабілі царскія ураДоўцы (чыноўнікі), а цяпер гэта робяць паны.

Цяжкі крыж выпаў на тваю долю, дарагая бацькаўшчына! Вагнявы віхор сусьветнае вайны разбурыў і спаліў твае хаты, а твой народ расьсеяў па неабхопленых прасторах Расеі. Касьцьмі тваіх дзяцей усеяны ўсе дарогі Расеі, Туркестану й Сыбіры. Дзесяткі тысяч тваіх лепшых сыноў палі сьмерцю на палёх Галіцыі, пад Варшаваю, Эрзэрумам і на ўсім прасторы ад Балтыцкага да Чорнага мора.

За што такая вялікая ахвяра? Ці за тое, каб уцалеўшыя й паварочаныя на бацькаўшчыну твае сыны знайшлі тут поўную слабоду ўміраць ад голаду і хваробаў?

Сапрон Каверда.

25 лютага 1921 г.
м. Вільня.

Пісьмо з вёскі.

У вёскі з беларускім насяленьнем прыяжджаюць, мабыць, панскія найміты, падкупленыя панамі баламуты з жульніцкімі вачыма. Яны ламаюць язык папольску, але мусяць ужываць, наўмысьля перакручываючы, беларускія, простыя словы, каб іхную брахню тут разумелі. Гэтыя жулікі часам навет прыкідаюцца беларусамі, каб толькі як-як абдурыць нашага брата. Часьцей, аднак, яны проста маняць бяз усякага сумленьня і сораму. Напрыклад, ведаючы, што газэт тут ня чытаюць, яны кажуць сялянам, што Беларускі Нацыянальны Камітэт у Вільні зачынены, што усе беларускія дзеячы паўцякалі да бальшавікоў, а каго злавілі, той згніець у вастрозе або трапіць проста пад растрэл, што ўжо ніякай Беларусі ня будзе, што трэба далучацца, бо ўжо ўсе віленскія работнікі паслалі дэлегацыю ў Парыж, прасіць, каб Вільню і таксама ўвесь наш край далучылі, і гэтак далей, і гэтак далей,— немагчыма сьпісаць навет у самых кароткіх словах усяго таго, што нам брэшуць розныя жулікі. Потым яшчэ кажуць, што ўсе беларускія дзеячы, навет самыя паважаныя сялянамі, падкуплены немцамі і бальшавікамі, што і ўсе беларускія газэты падкупленыя, — хоць-жа відзіць бог і людзі, што гэтыя, нібы-та падкупленыя газэты якраз пішуць самую праўду, а іхныя пахабныя лістоўкі, якія з сабою прывозяць, то толькі тым і займаюцца, што абліваюць брудам беларусаў і ліцьвіноў, бароняць паноў і маняць, быццам з імі сам бог і сам Пілсудзкі. Яны гэта робяць, каб застрашыць народ і прымусіць яго падпісацца пад усім, пад чым хочаш. Проста дзіва, як гэта дазваляюць такім ашуканцам сеяць вялікую трывогу і злосьць на вёсцы, і відаць, плоцяць ім добрыя грошы, бо яны аж з скуры выпінаюцца, каб задурыць галаву, а вось добрага чалавека, хто ўсё вытлумачыў-бы на праўдзе і людзкім языком, такога ня прысылаюць ніколі, такога на вёсцы яшчэ і ў вочы ня відзелі. То-ж бяруць падаткі, хай-бы-ж прыслалі акуратнага інструктара ад ураду, а забаранілі-бы манежыць стайковых коні розным панскім падлізам. Чаго яны хочуць? Яны хочуць, каб беларускія сяляне перш-наперш адракліся ад свае родныя мовы. Яны навет так падстраіваюць, каб сяляне, праваслаўныя беларусы, прасілі адчыніць расейскія школы. Іншы раз навет знойдуць і падцураць якога-небудзь вучыцялішку з неданоскаў, сынка ці дачушку быўшых розных чарнасотнікаў, каб адчынялі польскую школу з выкладаньнем расейскае мовы і чаго трэба парасейску. А потым падстраіваюць так, што школа тая робіцца чыстай польскай, падашлюць туды і вучыцеля свайго, каб навет на каталіцкую веру праваслаўных вучняў пераварнуў, а калі нічога не ўдаецца, то пастараюцца, каб школьны інспэктар, можа і нічога няведаўшы, зачыніў такую школу навекі, як маскальскую і бальшавіцкую. Гэтыя прыезныя баламуты страшэнна ня любяць запраўдных беларускіх вучыцялёў і гатовы ўтапіць іх у лыжцы свае сабачае шалёныя сьліны, каб толькі не дапусьціць запраўднае беларускае школы, якая моцна дзяржыцца і добра дзяцей навучае. Яны дзеля таго пішуць школьным інспэктарам і тайнай паліцыі розныя нягодныя даносы, і шэпчуць дзе хочаш, каб толькі дайсьці свае паганае мэты. А іхная мэта: каб беларус зрокся свае мовы, пайшоўшы ў чужую школу, або застаўся цёмным няўмекам, вырасшы зусім бяз ніякае навукі.

Таксама жулікі тыя заўсёды стараюцца пасварыць праваслаўных беларусаў і беларусаў каталіцкае веры, у чым нярэдка памагаюць ім асобы, якія пастаўлены навучаць людзей жыць у згодзе і прыязьні. Праўда, ёсьць добрыя папы, хоць болей сьвядомых ксяндзоў, што ня любяць тых жулікаў, толькі баяцца, і такія пастыры прымiраюць народ, кажучы, што ўсе, хто гаворыць папросту — адзін народ, аднае навет хрысьціянскае веры, толькі адны каталіцкага, а другія ўсходняга абраду. А баламуты, падкупленыя, мабыць, панамі, падбухторываюць католікаў, каб нашага-ж брата беларуса, тутэйшага, толькі хрышчонага ў іншым абрадзе, празываць маскалём і камуністам і выціскаць яго з роднага краю, што быццам тады болей зямлі застанецца каталіком. І дзе-ж тут праўда і справядлівасьць? І зямля тая, ня глядзячы на ўсялякія абяцанкі гэтых баламутаў, панскіх падлізаў, яшчэ невядома да якога часу будзе непадзеленая і хто ведае каму дастанецца. А нам-бы хапіла зямлі, і католікам і праваслаўным тутэйшым працоўным людзём. Толькі-ж вось без патрэбы езьдзяць і брэшуць ліхія людзі, сеюць злосьць, трывогу і непарадкі. І праз іх доўга ня будзе ў нас ладу. Бо добрых людзей вёска яшчэ ня відзела.

Дзед Кузьма.

Аб патрэбе залажэньня у Вільні літоўска-беларускага таварыства.

Праца беларускага грамадзянства над адраджэньнем народу ад самага пачатку часта спатыкалася на жыцьцёвай пуцявіне з магутным патокам вясеньнім вод народу літоўскага, скінуўшага цяжкую векавую апеку чужынцоў. Розна бывала ў дзеях беларуска-літоўскіх адносін; ціщына зьмянялася часам на кароткa вострaю спрэчкаю, аднак ніколі дзякуй Богу, да разрыва не дайшло. Па восені 1920 г. гэтыя адносіны ўвайшлі быццам у новую фазу: ўрады абодвух народаў згаварыліся аб супольных мэтах суседскага іх істнаваньня і аб помачы, якую маюць нясьці адзін другому. Дзіўная рэч, што наша Вільня на гэты толькі важны акт не адгукнулася ні ніякім урачыстым сходам ні маніфэстацыяй, у якой абедзьве стораны прынялі-б жывое ўчасьце і якая-б паказала Вільні і яе жыхарам, што ковенскія пастановы так у мясцовых ліцьвіноў, як у беларусаў знаходзяць чуткі водклік і поўнае зразуменьне ўсей іх важнасьці. Адазвалася папера ў газэтах, маўчалі жывыя людзі. Былі толькі стацьці, людзі нічога не казалі. Здаецца ня позна паправіць гэтую абмылку.

Як?

Беспрaменна трэба аснаваць чым хутчэй літоўска-беларускае таварыства. Ужо істнуюць у Вільні нацыянальныя камітэты: Літоўскі і Беларускі, хай жа цяпер яны паразумеюцца і склікаюць супольнае сабраньне ці сход сваіх сяброў, атрымаўшы раней мандат ад свайго грамадзянства. Кожны з гэтых камітэтаў на супольным сходзе выставіць сваіх кан-

дыдатаў па аднолькавым чысьле і так паўстане Літоўска-Беларускае Таварыства. Чуць цяпер у Вільні, што арганізуюцца польска-жыдоўскія таварыствы, маючыя на мэце зьбліжэньнэ гэтых народаў. Пеквая рэч. Ці Літ.-Бел. Т-ва мела-б менш асноў да істваваньня?! Калі-б нат' яно ня выступала зусім як афіцыяльнае прадстаўніца, а аграпічылася культурным і соцыяльным збліжэньнем, яно патрэбна. Голас літоўска-беларуска грамадянства быў бы тады мацнейшым у гэтым выпадку. Такое Т-ва ў Вільні былоб такжа трывалай мініатурай літоўска-беларускай згоды і дагавору ў Коўні, відзімым іх вокам. Яго клічам былобы: „Ня проціў каго - небудзь, а толькі для саміх сябе!

Чакаема!

Вінцук Скальманоўскі.

Ночы і думкі.

Есьць ночы белыя, есьць цёмныя, глухія,
Есьць ночы срэбныя і ночы галубыя...
Іх—больш за ўсё люблю з маркотным блескам зор,
Што на шаўку нябес са срэбра ткуць вузор...

Люблю іх за спакой бязьмерны і чароўны,
Люблю за сьвежасьць, цень, за смутак нявымоўны,
Што на душы ляжыць, калі сяджу адна
І заглядаю ў глыб нябесную бяз дна...

Есьць думкі сьветлыя, ёсьць прыкрыя, благія,
Есьць думкі сумныя і думкі ёсьць ціхія...
Іх—больш за ўсё люблю з маною той надзей,
З усім, што дорага зямной душы людзей.

Люблю за цішу іх, глыбокую, нямую,
За тое, што тады і сэрца не гаруе,
За тое, што тады душа гарыць, расьце,
За тое, што жыву ня так, як людзі ўсе...

І ночы срэбныя, празрыста-галубыя,
І думкі сумныя, глыбокія, ціхія
У маей душы плятуць, маўляў, адзін вузор
Як той, што ў вышы ткуць сьняжынкі сьветлых зор.

Натальля Арсеньнева.

75 гадоў опэры „Сялянка“.

Двухактовая камэдыя-опэра „Сялянка“ была першым беларускім творам Вінцука Марцінкевіча (1807—1884), каторы пісаў папольску і пабеларуску, але славу пісьменніка здабыў ня польскімі, а беларускімі творамі.

„Сялянка“ выйшла ў сьвет ў 1846 годзе. Напісана яна вершам і прозаю. Паны гавораць папольску, а войт Навум, Ціт і хор мужыкоў—пабеларуску. Беларуская мова дзеючых асоб добрая:

ХОР: Ой, бяда, будзе бяда,
Прыйшла на нас чарада!
Скажыце-ж, добры людзі,
Ды што з гэтага будзе?

ЦІТ: Заказаў-жа нам мацэр,
Ясны, моцны камісар,
Сабрацца чы ў карчму, чы ў двор
Мал, вялік, стары і хвор,
Войт усіх кіём пагнаў.

ХОР: Што-б ён дабра ня відаў!

ЦІТ: Ды і ён сюды ідзе,
Ен нам скажа аб бядзе...

Зьмешчаныя народныя песьні значна выпраўлены аўторам.

Ідэя ў „Сялянцы“ тая, што бог на небе і паноў і мужыкоў зароўна ўважаець (як аб гэтым кажаць паном Юлья, перапранутая пасялянску). Тут першы раз паказаўся марцінкевіцкі с а н т ы м е н т а л і з м і д ы к т а ч ы ч н а с ь ц ь, наіўнае жаданьне шляхоцкага поэта пагодзіць прыгонныя інтарэсы пана з правамі яго падданага хлопа. „Сялянка“—першы пункт Марцінкевіча ў яго соцыяльнай ідэолёгіі, якая мела для мужыкоў гэткі артыкул:

Хваліць толькі бога, шчыра працаваці,
Любіць добрых панаў, маўляў, родных
браці,—
Вось вашае дзела...

Як ведаем, гэтая ідэолёгія, пад уплывам вялікіх рэформ 60-х гадоў у Расеі, ня устоіла, і той жа пясьняр у вершы „Вясна, голад, перапала“: (1860 г.) сказаў за мужыкоў:

Будзем роўныя з панамі,
Будзем самі як паны...

„Сялянка“ была даволі пашырана, бо яшчэ ў астатнія гады хадзіла сярод беларускай абпалячанай шляхты ў сьпісках бяз подпісу аўтора. Опэрную музыку да „Сялянкі“ напісаў вядомы польскі композытар—беларус Станіслаў Манюшка, друг Марцінкевіча і таксама родам з Меншчыны. «Сялянка» была на менскай сцэне і мела вялікі ўсьпех. Роль войта Навума згуляў сам Марцінкевіч.

Значаньне опэры „Сялянка“ дзеля беларускае літэратура аказалася ў тым, што яна разварушыла беларускія тэндэнцыі сярод шляхты, гэтай, значнай часткі нашай тагачаснай інтэлігэнцыі.

І хоць „Сялянка“ дзеля панска-шляхоцкага характару ня варта стануць побач з лепшымі творамі свайго-ж аўтора, як скажам, з першай беларускай повесьцю „Гапон“ (1854), яна з боку гістарычнага дорага нам, як першы крок творчасьці Марцінкевіча на родным грунце. Зрабіўшы гэты першы крок, Марцінкевіч, далёкі ад нашай сучаснай нацыянальнай і клясавай сьвядомасьці, як далёка неба ад зямлі, тымчасам сеяў зярняты беларускай сьвядомасьці поўнаю жменяю. І яго стродкі судзьдзя Я. Купала з удзячнасьцю і справядліва пяе аб ім (1910 г.):

Як сторож, стаў сьмела на варце
Радзімых запушчаных гоняў,
Стаў сеяць пасвойску ўсё тое,
Што мы далей сеем сягоньня...

А. Мсьціслаўскі.

Абавязковая навука пабеларуску.

(Ад нашага карэспандэнта.)

Ц. С. К. Беларускай Савецкай Рэспублікі пастанавіў, каб навучаньне у пачаткавых школах дзяцей беларускага насяленьня было абавязкова на беларускай мове.

Узьбіліся на свой шлях.*)

Праз некалькі часу ў Слуцак прыехаў вядомы драматург-актор Галубок, які так сама паставіў два вечары й яшчэ балей зацікавіў публіку. З гэтага часу справа беларуская на Случчыне пайшла шмат уперад. Сяброў у гуртку было ўжо да трох соцен, амаль што ня ўся інтэлегэнцыя Слуцкая аб'ядналася вокала гуртка. Тым часам гурткі па мястэчках і вёсках так сама сталі расьці. Дзе ні паехаць, дзе ні пайці, толькі й чуеш гутарку пра Беларусь. Тады Камітэт разаслаў яшчэ агітатараў, якія пабывалі ў кожнай вёсцы й растлумачылі сялянству, як належыць, пра справу беларускую, так што з таго часу Камітэт быў перапоўнен народам, які прыходзіў па розныя справкі й рады, не зважаючы на пагрозы масцовае польскае ўлады. Тады палякі ні з сяго ні з таго зачынілі гурток „Папараць-Кветку“, павесілі да шахваў замкі, прыляпілі пячаткі й баста, але, трэба прызнацца, адарвалі з заду шахваў сябры гуртка дошкі й дачыста выбралі ўсё тое, што там знаходзілася, пакінулі толькі ім пад замкамі трохі старых газэт. Літэратуру ўсю разаслалі па вёсках, школах і другіх гуртках. Праўда літэратуры з Менску прывозілі што месяц дзесяткамі пудоў, але яе ніколі не хапала, бо надта скора распрадавалася. Так гурток „Папараць-Кветка“ й застаўся зачыненым аж да другое паловы лістапада 1920 года.

Ня глецзячы на гэта, Камітэт дастаў аднекуль дазвол клапаціцца, або, як кажуць, браць напарукі зарыштаваных беларусаў. Як хваля, людзі йшлі і шматшмат хто, дзякуючы Камітэту, быў вызвалены з-пад арэшту. Былі выпадкі, што навет угалоўнікаў Камітэт браў напарукі й палякі згаджаліся. Працаваць толькі ў Камітэце й ставіць вечары-гэтага мала. Сябры камітэту задумалі адчыніць беларускую Коопэратыву „Зара“. Вось гэтая коопэратыва так шчыра ўзялася за працу, што навет шмат адабрала пайшчыкаў ад польскіх коопэратываў і стала самаю найбольшаю Коопэратываю на ўсёй Случчыне. З працаўнікоў гэтае коопэратывы вядомы: К. Барановскі, Асьвяцімскі, Дубіна, Федараў і Кляка. Нацыянальны Камітэт увесь час вёў арганізацыйную працу й такім парадкам дажыў да прыхода бальшавікоў улетку 1920 года. Як толькі прыйшлі бальшавікі, Камітэт зачыніўся, а разам з ім і коопэратыва „Зара“ так сама перастала йснаваць. Здавалася-б, што справа беларуская ўжо на Случчыне памерла, але-ж не. Партыя беларускіх сацыялістаў-рэвалюцыянераў адчыніла свой Камітэт ды як раз у тым самым памяшканьні, дзе быў спачатку Нацыян. Камітэт. Грамадзянства, як згаварыўшыся, ізноў тоўпіцца ў гэтым сац.-рэвал. Камітэце. Прыйшла восень, сталі адчыняцца школы. Вядомая рэч, дзе толькі адчыняецца школа, дык абавязкова беларуская, а калі расейская, дык каб выкладалася й беларуская мова, але гэта цягнулася ня доўга, бо скора йзноў прыйшлі палякі. Мушу заўважыць, што вельмі многа сяброў з беларускіх арганізацый стараліся, калі бальшавікі мабілізавалі, застацца ў якой-небудзь установе ў Слуцку, альбо блізка ля яго. Вельмі перапрашаю, што не ў пару ўспамяну, але лічу патрэбным адзначыць у кароткіх словах беларускія курсы для вучыцялёў, якія адбыліся з 25 красавіка па 1 чэрвеня 1920 года ў Слуцку.

Якім-та парадкам Школьная Рада Меншчыны дастала ад польскае ўлады крыху грошай на гэтыя курсы. Пры тым загадчыкам гэтых курсаў назначыла паважанага пана Я. Станкевіча. На курсы, нягледзячы на працоўны час на полі, зьехалася з усяго павету сот чатыры вучыцялёў з вольнымі слухачамі. З Менску ў той час прывязьлі шмат літэратуры й вось вучыцялі заклалі кніжную коопэратыву. Значыцца, усе гэтыя слухачы курсаў цэлы дзень ля гэтых кніжак, а лекцыі на курсах пачыналіся а трэцяй гадзіне па паўдні. Як толькі падходзіць гэты час, дык ўся грамэда йдзе да Камэрцыйнае школы, дзе чыталіся лекцыі, й так расьцягнецца, што здаецца, полк ідзе. Вось гэта устрывожыла палякоў, і зараз-жа Польскі Школьны інспэктар зачыняе курсы. Доўга не чакаючы, паслалі да Менска тэлеграму й праз пару дзён атрымалі дазвол „зьверху“ адчыніць курсы. Мясцовыя польскія ўлады гэтым былі надта нездаволены, але хоцькі-ня-хоцькі мусілі згадзіцца. У салі на лекцыях часта можна было бачыць духавенства, а падчас і польскіх ахвіцэраў, якія выслухоўвалі ўсе чатыры лекцыі. Беларускія курсы скончыліся, а зараз-жа за імі вучыцельства прымушана было йсьці на польскія курсы, якія трывалі толькі адзін дзень. Сталася гэта таму, што палякі ўжо уцякалі ад бальшавікоў.

Такім чынам, справа беларуская на Случчыне ўсё пры новых і новых акупантах ішла наперад і дачакала апошніх дзён кастрычніка 1920 года, калі палякі зьявіліся да Слуцка другі раз.

З прыходам палякоў другі раз на Случчыну беларускі Нацыянальны Камітэт зараз-жа распачаў сваю працу. Дзякуючы таму, што Слуцах у гэты час быў адрэзан ад другіх беларускія цэнтраў, Камітэт паслаў ад сябе прадстаўніка ў Варшаву дзеля зносін з Цэнтральным Беларускім Нацыянальным Камітэтам—п. Жаўрыда. Сяброў з гэтага Камітэту засталося толькі два, а два, баючыся палякоў, выехалі з бальшавікамі. Склалася новая йніцыятыўная група беларусаў, якая склікала грамадзкі сход, каб напоўніць Камітэт новымі сябрамі. На гэтым сходзе было 450 прысутных асоб і яны да старога Камітэту давыбралі яшчэ 7 сяброў. Такім чынам у склад Камітэта вайшло ўжо 12 асоб, але стары Камітэт ня прызнаў некаторых новых сяброў, лічачы іх русіфікатарамі. Значыцца, пайшлі спрэчкі, стары Камітэт адмовіўся працаваць да прыезду пасланага прадстаўніка. Старшынёю новага Камітэту застаўся доктар Паўлюкевіч, надта энэргічны працаўнік, але на ніве бацькаўшчыны чалавек новы.

Давыбары Камітэту адбыліся 2 лістапада 1920 года. З гэтага часу й павяліся спрэчкі памiж сябрамі новага й старога Камітэта. Час не чакаў: трэба было як найхутчэй арганізаваць грамадзкую ўладу. Камітэт адразу арганізаваў міліцыю й разаслаў яе па вучастках павету. Начальнікам павятовае міліцыі быў назначаны п. Мацэлькі. Ен не афіцыяльным парадкама адчыніў запісь ахвотнікаў у рэзэрў народнае міліцыі. У кожнай воласьці был арганізаваны, замест польскіх войтаў, беларускія Камітэты, а ўжо воласьці арганізавалі Камітэты ў кожнай вёсцы. Так што ўвесь павет стаўся чыстым беларускім з сваім праўленьнем і т. д. Нацыянальны Камітэт Случчыны ўжо ня мог трываць далей, а трэба было што-небудзь шырэйшае. Вось Камітэт пастанавіў склікаць павятовы зьезд па пяць прадстаўнікоў ад кожнае воласьці й па адным ад кожнае культурна-прасьветнае арганізацыі. Зьезд назначаны быў на 14 лістапада. Кав выбары прадстаўнікоў па валасьцёх прайшлі як належыць, дык Камітэт разаслаў па валасьцёх інструктароў, якія и зрабілі выбары. На зьезд зьехалася 107 прадстаўнікоў з правам пастанаўляючага голасу й 10 прадстаўнікоў з правам дарадчага голасу.

Зьезд адчыніўся а 12 гадзіне дня 14 лістапада, перад пачаткам якога была прапета беларуская марсэльеза й гімн. Старшынёю зьезду быў выбраны грам. В. Русак. Пасьля розных дакладаў беларускіх дзеячоў і дакладаў з месцаў была вынесена рэзалюцыя выбраць Р а д у С л у ч ч ы н ы Б е л а р у с к а й Н а р о д н а й Р э с п у б л і к і.

З дакладу прадстаўніка Жаўрыда, якога паслаў Нацыянальны Камітэт у Варшаву, выявілася, што ён мае нейкія паўнамоцтвы ад Цэнтральнага Камітэту і што ў Раду трэба выбраць 17 асоб.

Прытым зьезд вынес рэзалюцыю падняць сьцяг узброенае барацьбы про-

*) Гл. № 9 „Н. Д.“.

Дзеля гэтае мэты у кожным павеце арганізаваны курсы беларускае мовы для вучыцялеу, не маючых належнае кваліфікацыі.

Водле пастановы Ц. С. К. на пераход да выкладаньня навукі пабеларуску даецца тры месяцы; пасьля гэтага часу няуменьне вучыцялеу навучаць пабеларуску будзе перасьледовацца.

Эсэрау выпусьцілі на волю.

(Ад нашага карэспандэнта.)

Усіх заарыштаваных у Менску сяброу беларускае Партыі Соцыялістау-рэволюцыянэрау, апрача Мамонькі і Бадуновай, цяпер ужо выпусьцілі з турмы на волю.

Прычынаю арэштау, як кажуць, быу прыезд Мамонькі з-за граніцы і наагул „дзеяльнасьць" гэтага няудалага эсэра.

Кандыдатура Краскоускага.

— У літоускіх газэтах зьявіліся весткі з Коуні, што віленскія і ковенскія беларусы прапануюць літоускаму ураду замяніць цяперашняга міністра беларускіх спрау Сямашку выдатным прогрэсыуным дзеячам краю грам. Краскоускім, бышым да вайны інспэктарам гімназіі Вінаградава.

ціў маскоўскае акупацыі за незалежнасьць Беларусі.

Якім-та чынам на гэты зьезд папалі два ахвіцэры ад Булак-Балаховіча, катoрыя стараліся каб зьезд прызнаў Балаховіча, але жаднае ўвагі на іх зьвернута не было.

Зьезд выбраў Раду, у склад якое вайшлі гэткія асобы: Пракулевіч, Жаўрыд, Паўлюкевіч, Мацэльлі, Біруковіч, Сасноўскі, Русак, Лістапад, Каўпак, Бабарэка, Раковіч, Радзюк, Барысавец, Рабы, Анцыповіч, Дубіна й Няронскі.

Радзе прадстаўніцтвам народным і была даручана грамадзкая ўлада й арганізацыя войска.

Зьезд цягнуўся ад 12 гадзін дня 14 да 10 гадзін вечара 15 лістапада 1920 г.

Я першы раз на сваім жыцьці быў на такім зьездзе: ніводзін прадстаўнік за ўвесь час нікуды не адлучыўся і усе пытаньні абгаварываліся й зацьвярджаліся так удачна, як быццым гэта рабіў адзін чалавек. Цікава, вельмі цікава зьезд прайшоў і зачыніўся пад сьпевам марсэльезы й гімна.

Такім чынам Беларускі Нацыянальны Камітэт Случчыны перастаў жыць, а на месца яго арганізавалася Рада Случчыны Беларускай Народнай Рэспублікі.

Значчыцца, з 16-га лістапада Рада адчыніла свае функцыі. Раней за ўсе трэба было фарміраваць войска. Тады з Рады вызначылі трох сяброў: Жаўрыда, Анцыновіча й Мацэльлі, яны й склалі вайсковую тройку, а рэшта сяброў Рады павінна была ўзяцца за арганізацыю розных грамадзкіх установаў. Вайсковая тройка апрацавала адозву, ці вярней кліч, да моладзі з тым, калі каму дорага бацькаўшчына, каб ішоў у беларускае войска.

Ю. Лістапад.

(Далей будзе).

Палітычны агляд.

Савецкая Расея. Апошнія паведамленьні падцьвярджаюць, што контр-рэвалюцыйны рух не заціснуты і ўсё болей пашыраецца. Дзеля змаганьня з паўстаўшымі утворан трыумвірат з Троцкага, Дзяржынскага і Каменева, з дыктатарскаю ўладаю. Абвешчана военнае становішча ў 16 губэрнях.

Грузія. Чырвоная армія разграміла грузінскую армію і заняла Тыфліс, Кутаіс і інш. гарады. Туркі забралі паўдзённую частку Грузіі. Уратаваць Грузінскую рэспубліку могуць цяпер толькі разрухі ў Савецкай Расеі.

Далекі Усход. Становішча на Далёкім Усходзе пакуль што дзеля нас нявыразнае. Савецкія газэты паведамляюць, што Японія пачала ваенныя дзеяньні супроць Савецкае Расеі ў Сыбіры. Супроцьбальшавіцкія аддзелы Сяменава, Анненкава і Гербакова палучыліся з Японскай арміяй.

Лендакская канфэрэнцыя. Контр-прапазыцыі Нямеччыны, дзе паказаны прычыны немагчымасьці споўніць вымогі хаўрусьнікаў, Англіяй і Францыяй адкінуты. Нямеччына дастала ультыматум, на які павінна была даць адказ у прошлы панядзелак 7 сакавіка пад страхам, што йначай перагаворы будуць спынены. Хаўрусьнікі, глаўным чынам Францыя і затым Англія, на выпадак няслухмянства Нямеччыны, намераны забраць яшчэ новыя нямецкія землі аж да Рэйна, блакіраваць Гамбург і інш. Нямецкі прадстаўнік, міністр заграніччных спраў доктар Сіманс адказаў, што нямецкая дэлегацыя абмяркуе вымогі хаўрусьнікаў, але што Нямеччына валей пакарыцца гвалтоўнаму адбіраньню грошы за тавары, чымся па добрай волі дасьць згоду на гэткія нязвычайныя вымогі. Уся нямецкая прэса падчырківае сур'ёзнасьць палітычнага становішча. Правыя газэты вымагаюць ад дэлегацыі „быць цьвёрдай і не паддавацца". Газэта камуністычнае нямецкае партыі „Чырвоны штандар" заяўляе, што калі буржуазія Нямеччыны ня ўступіць у Лёндане і зайграе ваенны марш, то хор пролетар'ята адкажаць не нацыянальным нямецкім гімнам і не францускай марсэльезай, а зусім іншаю песьняю—Інтэрнацыяналам.

Францыя. Амаль ня ўсе газэты надта здаволены тым, што на Лёнданскай канфэрэнцыі, нібы-та, удалося дайсьці поўнае згоды з Англіяй у змаганьні супроць Нямеччыны і называе гэты гэты дзень гістарычным дзеля Францыі днём.

Турцыя дзяржыцца на Лёнданскай канфэрэнцыі—калі не пабядзіцелькаю, дык і ня сходанаю. Яна там вымагаець аднаўленьня ў Эўропе турэцкіх граніцаў 1913 года, ачышчэньня хаўрусьнікамі Канстантынопаля і берагоў, слабоднага плаваньня цераз праліvы, выхаду грэкаў з Сьмірнскае краіны, права мець патрэбны ёй лік ваарўжонае сілы і г. д.

Грэцыя вуснамі Народнага Сабраньня пратэстуе супроць уступак Антанты турэцкім нацыяналістам, яна ня хоча пакідаць Сьмірнскую краіну і аддаваць назад Фракію. Па ўсей Грэцыі былі дэмонстрацыі супроць пастаноў на Лёнданскай канфэрэнцыі.

Італія. Па ўсёй Італіі выбухаюць сялянскія бунты з пажарамі і рознымі разрухамі, а таксама забастоўкі рабочых. Есьць забітыя і раненыя пры спатычках з войскам.

Ш.

ШТОДЗЕННЫЯ ВЕСТКІ.

Чацьвер, 3 сакавіка 1921 г.

— У Рэўлю адбылася канфэрэнцыя прадстаўнікоў Літвы, Лацьвіі і Фінляндыі, на якой радзіліся аб стварэньні балтыцкага хаўруса.

— Па ўсёй Польшчы пракацілася хваля забастовак.

— Прыходзяць кароткія паведамленьні, што ў Пецярбурзе і Кранштаце бунт, у Маскве забастоўкі і страляніна, у Сыбіры паўстаньне сялян.

— Чырвоная армія забрала ўсю Грузію. Устаноўчы Сойм і ўрад Грузіі сеў на францускі крэйсер „Вальдэк-Русо" ў Батуме.

— У сьнежні леташняга году памёр у Віньніцы, Падольскае губэрні, вядомы ўкраінскі пісьменьнік Зьмітро Марковіч.

— У Францыі памёр бышы кароль Чарнагоры Мікола.

Пятніца, 4 сакавіка 1921 г.

— У Лізе Нацый на паседжаньні 1-га сакавіка была войстрая спрэчка між прадстаўніком Літвы Гальваноўскім і прадстаўніком Польшчы Ашкеназі. Пастанова ня вынесена дзеля таго што ёсьць прапазыцыя зрабіць у Брусэлі беспасрэдныя перагаворы між Польшчай і Літвою.

— Нямецкія газэты ў Рызе пішуць, што польска - маскоўскі мір будзе падпісан 15 сакавіка (марца).

— Констытуцыйная Камісія Польскага Сойму вычыркнула 43 артыкул констытуцыі, водле якога прэзыдэнтам польскай рэспублікі можа быць толькі паляк-каталік.

Субота, 5 сакавіка 1921 г.

— Рада Лігі Нацый ізноу разгледзіла польска-літоускую спрэчку. Пастаноулена, што польскі і літоускі дэлегаты запрапануюць сваім урадам начаць безпасрэднія перагаворы цераз месяц у Брусэлі (Бельгія) пад пратэктаратам Лігі Нацый і старшынством Гюісманса.

— Хаўрусьнікі рашуча адкінулі контр-прапазыцыі Нямеччыны.

— Агульная забастоўка ў Польшчы ліквідавана.

— З Токіо паведамляюць, што Японія пачала вайну супроць Савецкае Федэрацыі. Кітай абвесьціў нейтралітэт.

— Давіць паўстаньне Антонава, б. бальшавіцкага камандуючага, а цяпер правадыра сялян, паслалі Будзённага з камуністычнымі палкамі. Антонаў адступаець ад Казлова.

— У Корку пакаралі сьмерцьцю 6 сінфэйнераў (ірляндзкіх рэволюцыянэраў-незалежнікаў) за ўбіўства ангельцаў.

Нядзеля, 6 сакавіка 1921 г.

— З Парыжу ад 4 сакавіка паведамляюць, што Літва і Польшча аб беспасрэдніх перагаворах дадуць адказ цераз 10 дзён.

— На Каўказе паўстаньне супроць маскоўскай акупацыі.

— У Маскве заарыштована ўся грузінская місія.

— У Саснавіцах (Польшча) заарыштована 300 рабочых дэпутатаў і разьлічана са службы 80 рабочых. (Е. Е.).

Панядзелак, 7 сакавіка 1921 г.

— Маскоўскае радыо ад 6 сакавіка паведамляе, што б. царскі генарал Казлоўскі, з падмогаю эсэраў і меншавікоў узьняў у Кранштаце паўстаньне супроць савецкае ўлады. (Е. Е.).

— У Аравіі шырыцца паўстаньне.

— У Манчжурыі чума.

— Польская рада міністраў пастанавіла скасаваць дэкрэт аб мілітарызацыі чыгунак.

— 5 сакавіка ў Харкаве адчыніўся ўсеукраінскі зьезд саветаў.

— Гардынг заняў ужо пасаду прэзыдэнта Паўночна-амэрыканскіх злучаных гаспадарстваў.

Аўторак, 8 сакавіка 1921 г.

— Лойд-Джордж уручыу у чацьвер д-ру Сімансу ультыматыу хаурусьнікау Нямеччыне, адказ на які быу назначан на панядзелак.

— Бунт у Маскве супроць саветаў крывава падаўлены.

— У ангельскіх газэтах надрукован сэкрэтны даклад Троцкага аб аднаўленьні вясною наступленьня на Польшчу.

Серада, 9-га сакавіка 1921 г.

— Данцыгскія газэты паведамляюць, што рада паслоў упаўнаважыла Літву карыстацца портам у Кляйпэдзе, аслабаніўшы яе ад мытных збораў.

— Д-р Сіманс прыслаў дэпешу, што Нямеччына не падпіша ўмовы ў Лёндане.

— Іофэ заявіў на перагаворах у Рызе, што ён хоча перарваць перагаворы да канца Сакавіка.

Эстонія перарвала гандлёвыя зносіны з Расеяй з прычыны паўстаньняў супроць саветаў.

— Красін ізноў прыехаў у Лёндан.

— Новы амэрыканскі прэзыдэнт Гардынг сказаў першую прамову, у якой паказаў праграму свае дзеяльнасьці. Гардынг ня хоча ўмешывацца ў справы Эўропы.

Весткі з Савецкай Беларусі.

(Пярэдрук з менскай бальшавіцкай штодзеннай газэты на беларускай мове „Савецкая Беларусь" № 145).

Навуковая Камісія.

Пры Навукова-літэратурным Аддзеле Наркамиросу заложана з 15 асоб навуковая камісія па апрацаваньню беларускай тэрмінолёгіі. Камісія мае на мэце, як састаўленьне новай тэрминолёгіі, так і перагляд істнуючай. Сваю працу камісія мае выпаўніць на працягу трох месяцаў.

Педагагічныя курсы.

Вясною гэтага году пры Наркамасьветы Беларусі адчынюцца 10-ці месячныя педагагічныя курсы школьных працаўнікоў для беларускіх школ 1-ай ступені. На курсы прымаюцца асобы з асьветай ня ніжэй вышэйшай пачатковай школы, ці 4-ох клясаў быўшых сярэдніх школ. Для асоб з асьветай ніжэйшай будзе зроблен калёквіум.

Курсанты будуць мець поўнае утрыманьне і кватэру дарма ад Наркамасьветы. Заявы аб залічэньні на курсы прымаюцца ў Беларускім Аддзеле Наркамасьветы, куды і трэба іх напраўляць па такому адрасу: м. Менск, Беларускі аддзел Наркамасьветы. Аб часе адчыненьня курсаў будзе абвешчана асобна.

У Інстытуце Народнае Асьветы.

Інстытут Народнае Асьветы запрашае асоб, жадаючых узяць на сябе чытаньне лекцыяў беларускай мовы для студэнтаў інстытуту, падаваць адпаведныя заявы ў канцылярыю інстытуту, уласпаручна альбо па пошце.

К заяве патрэбна далучыць:

1) апісаньне жыцьця.

2) Сьпіс вучонай працы, калі такая маецца.

Курсы у Лагойску.

(Барысаўскі павет.)

У м. Лагойску Барысаўскага павету пры прафэсыянальным Саюзе адчыніліся вячэрнія палітычныя і агульна-навуковыя курсы для дарослых. На курсы запісалася 55 чалавек. Курсы працуюць досыць добра.

Гэтымі днямі адчынілася музыкальная школа. Дзеля недахвату вучыцялёў з запісаўшыхся 70 чалавек у школу прынята толькі 25.

Пошасьць.

(Сеньніцкая вол. Менск. пав.).

Вёска Дубякі—вялікая: хат у ёй больш 200; сяляне бедныя, малазямельныя, ня маюць коняў; хаты старыя, брудныя. Але гэта яшчэ нічога. Бяда ў тым, што разьвяліся заразныя хваробы.

У Дуняках пануе плямісты тыфус. Доктара няма, фэльшара гэтак сама. Ад воласьці 25 вёрст. З помаччу нікто не паказваецца, быццам нікому няма да гэтага дзела. Неабходна зараз жа паслаць дакторскую помач.

Курсы навуковай фатаграфіі.

У хуткім часе пры Беларускім Дзяржаўным Палітэхнікуме наладжываюцца курсы навуковай фатаграфіі.

У савецкіх сталоуках.

Адчыненьне сталовак дзела вельмі добрае і іх у Менску адчынена вельмі многа. Але калі зайдзеш у сталоўку і і паглядзіш, як людзі ядуць, дык здаецца, бачыш ня людзей, а сьвіней. Лыжак у сталоўках няма, і абедаючым прыходзіцца есьці страву ня лыжкамі, а проста сёрбаць з місак. У гэтым многа вінавата і наша „сьвядомае“ грамадзянства, якое, выбачайце, крадзе лыжкі і міскі. Грязь у сталоўках такая, што, здаецца, такой гразі няма ня толькі ў прыстойных, а навет у самых брудных хлявох. Усе сталы ўвэдзганы ў страву, тыя, якія падаюць, так сама ўвэдзганы, талерак добра ня мыюць і калі па гэтай „памытай“ талерцы павясьці пальцам, дык на пальцы застанецца цэлая куча гною.

Калі мы параўнаем абед 11 сталоўкі з абедам 6, дык убачым, што ў 11 сталоўцы з аднаго абеда і кот не пад'есьць, у 6-жа ўсё ж такі абед большы і лепшы.

11 сталоўка харчы крадзе і абедаючым прыходзіцца галадаваць.

У 6-ай сталоўцы істнуе нейкая пратэкцыя. Знаёмым, як відаць, даюць абеды зараз жа, незнаёмым прыходзіцца чакаць, чакаць, сварыцца і ў канцыканцоўісьці непаабедаўшы.

Беспартыйныя сялянскія канфэрэнцыі.

(Бабруйскі павет.)

У апошнія часы па павету адбываюцца беспартыйныя сялянскія канфэрэнцыі.

Канфэрэнцыя ў Замошскай воласьці прайшла вельмі жвава. Пры разглядзе зямельнага пытаньня, намеціліся два кірункі: першы кірунак за разьдзел зямлі ва асобныя хутары, другі—за перадаў зямлі па зямельнай раформе. Верх узяў другі кірунак.

Выданьне беларускіх кніг.

У № 36 менскае бальшавіцкае газэты на расейскай мове „Звезда“ знаходзім вось які артыкул.

„Дзяржаўнае выдавецтва ў сучасны мамэнт энэргічна бярэцца за ўзмацненьне працы па выданьню літэратуры і дапамог на мясцовых мовах і, галоўным чынам, на беларускай.

Найвялікшыя труднасьці дзяржаўнае выдавецтва спатыкае дзеля нястачы тэхнічных сродстваў.

У Менску ёсьць вельмі мала беларускіх шрыфтаў і чуецца вялікая нястача работніцкіх рук.

Пры палепшаньні і папаўненьні беларускіх друкарняў уласнымі сродствамі зьявіцца магчымасьць скласьці ня больш 2-х друкаваных аркушаў у тыдзень. Гэта пэўна-ж надта мала і дзяржаўнае выдавецтва ў сувязі з гэтым, лічыць патрэбным: папоўніць пяць друкарняў беларускімі шрыфтамі, каторыя дабыць ў Маскве, зрабіць даліўку да некаторых расейскіх шрыфтаў. Калі гэта ня ўдасца ў Маскве—купіць за граніцай. Знайсьці спосаб здабыць матрыцы беларускіх падручнікаў, друкаваных у Вільні. Атрымаць згоду гаспадарсьцьвеннага выдавецтва Р. С. Ф. С. Р. на права беспасрэдніх зносін дзяржаўнага выдавецтва Беларусі з яго прадстаўнікамі за граніцай і беспасрэдняй перадачы яму заказаў на беларускай мове на рахунак гаспадарсьцьвеннага выдавецтва Р. С. Ф. С. Р., ці дабіцца дазволу на адкрыцьце незалежнага выдавецтва на беларускай мове ў Ліцьве ці ў Лацьвіі беспасрэдня на рахунак С. С. Р. Б.

Да ўтварэньня выдавецтва за граніцай купіць у Ліцьве падручнікі на беларускай і жыдоўскай мове, якія цяпер ёсьць.

Калі меры, прынятыя дзяржаўным выдавецтвам, будуць праведзены ў жыцьцё, тады ўдасца разьдзяліць працу такім чынам, што ў Менску будуць друкавацца перыодычныя выданьні (газэты і журналы), дробныя брашуры, а таксама сьпешныя працы. Падручнікі ж, навуковыя і папулярныя выданьні будуць друкавацца за граніцаю.

У м. Бабруйску адчынена аддзяленьне Гаспадарсьцьвеннага Выдавецтва Беларусі“.

Інстытут беларускае культуры.

Пад гэткім назовам зьмешчан у № 6 „Белорусской Деревни“ вось які артыкул:

„Яшчэ ня так даўна над беларускай гутаркай, над беларускімі звычаямі сьмяяліся і называлі іх хамскімі, мужыцкімі. Гаманіць па беларуску забаранялася і за адно беларускае слова ў школе дралі за вушы ці ставілі адзінкі. Рэвалюцыя зьніштожыла гэты зьдзек над народным скарбам. У сучасны мамэнт у Менску арганізуецца Інстытут Беларускае Культуры, каторы павінен будзе заняцца вучэньнем усяго беларускага. Ужо апрацаваны устаў гэтага інстытуту і гэтымі днямі будзе аддадзены на зацьверджаньне Рады Народных Камісараў нашай Рэспублікі. Пасьля зацьверджаньня устава зьявіцца магчымасьць усім беларускім культурным сілам, якія да гэтага часу працавалі пасобку, працаваць разам, агульнымі сіламі, каб скарэй падняць нашу родную культуру і навуку“.

З прыватнага жарала мы даведаліся, што ў раду Інстытута Беларускае Культуры выбраны Янка Купала, Жылуновіч, Бадунова, Некрашэвіч і інш.

Нявіданае зьявішча.

(В. Капцоўка, Горніцк. в., Горадз. пав.).

Крэсаўцы, наглядзеўшыся на працу Грамад Беларускае Моладзі ў Горадзеншчыне, давай з завісьці рабіць свае польскія „Kółka Młodzieży“. Беларускія Грамады Моладзі арганізоўваліся самі па сабе, бяз жадных інструктароў і працавалі і працуюць увесь час пад страхам арэшту, сябры ураду, кладучыся спаць, не гарантыраваныя ў тым, што прачхнуцца могуць на турэмных нарах, але ня гледзячы на усё гэта, працуюць што раз усё з новаю практыкаю. Крэсоўскія „Kółka Młodzieży“ наадварот: маюць капітал, маюць свабоду слова, друку ды яшчэ кадр інструктароў пры «Стражы Крэсовай» па арганізацыі такіх „kółków“ і то ня могуць працаваць на вёсках і мястэчках. І не праходзіць тыдня пасьля арганізацыі, як зачыняюцца, бо палякоў ў мястэчках і вёсках няма, а кіям з беларуса паляка ня зробіш. Усё гэта можна праверыць на факце. Вот адзін з многіх. Прыехаў адзін раз інструктар «Крэсаў» ў вёску Капцоўку Горніцкае воласьці каб арганізаваць „Kółko Młodzieży“. Для гэтага быў склікавы сход ў гміне. Прышлі на сход усе: каталікі і праваслаўныя. Пасьля вялікае патрыатычнае гутаркі інструктара, каторую пэўне мала хто з прысутных каталікоў зразумеў, пастаноўлена было выбраць «Zarząd Kółka». Горніцкая воласьць, пэўне таму што блізка Гораду, славіцца беларускаю сьвядомасьцю. З назначаных кандыдатаў ў урад былі сьвядомыя беларусы. Як шовініст-паляк войт Шыманскі тут падняў свой голас: „Якжа, каб маскалі папалі ў „Zarząd“ «Kółka», то немагчыма!..“ Ен крычаў і лаяўся. Але яго ня вельмі слухалі, і выбранымі засталіся: пісар гміны — як старшыня „Kółka“, вучыцелька польская, як сэкратар (гэтыя двое не Капцоўскія: вучыцелька з Галіцыі, а пісар скульсьці з Гораду) і тры сябры ураду тутэйшыя вясковыя інтэлегенты—сьвядомыя беларусы. Войт яшчэ болей пачаў крычаць і лаяць усіх беларусаў—маскалямі.

Праз тыдзень на паседжаньні урад пастанавіў згуляць спэктакль ў Капцоўцы і разыграць дзьве аднаактоўкі, адну польскую, а другую беларускую, але ні войт, ні староста не пазволіў паставіць беларускае п'ескі на вёсцы. Такія вынікі заставілі ўсіх вясковых інтэлігентаў выйсьці з „Kółka“, і пастаноўка спэктаклю была адложана на тыдзень, каб набраць новых артыстаў хоць якіх колечы, абы чалавек. Вучыцелька была рэжысэрам, і цэлы тыдзень штодня ішлі рэпэтыцыі, пакуль усе артысты ня вывучылі напамяць роляў. Ксёндз два разы гаварыў ў касьцёле на амбоне пра спэктакль, так што усіх зацікавіў, і вечарам сабралася на спэктакль шмат публікі, як каталікоў, так і праваслаўных, на нявіданае зьявішча „крэсаў“. Ставілася якаясь казка, як кароль улюбіўся ў адну панянку, але-ж не ў паненку, а ў вучыцельку. Адна кабета, прышоўшая першы раз на спэктакль, у той час, калі кароль стаяў на каленях і прасіў рукі ў „Вучыцелькі“, да сваяго мужыка пачала голасна гаварыць: „Пятрук! ля! ля!.. што гэта Міхась Баўтрусеў робіць!.. штосьці гаворыць папольску да вучыцелькі... сватаецца да яе! Няўжо-ж яна за яго замуж пойдзе?.. Ай-ей-ей!.. Ля, ля! Што Міхась робіць з вучыцелькаю, цалуецца!..“ Апошнія словы яна, забыўшыся, гаварыла голасна, і зусіх кутоў вясковае школы пачаўся сьмех. Міхась ня мог устрымацца ад стыду на сцэне і ўцёк за кулісы. Пачаўся сьвіст і мацнейшы сьмех. Спэктакль праваліўся і праваліліся як ў зямлю „Kółko Młodzieży“ ў Капцоўцы. Міхась Баўтрусеў ад спэктаклю дастаў новую клічку на вёсцы „Польскага Караля“, а „Стража Крэсова“ ужо больш не паказывае польскіх каралёў і вучыцелек на сцэне.

М. Гусак.

М. Рось, Горадзенскае губэрні.

Сьвядомасьць беларуская вельмі добра пашыраецца, толькі няма школаў. Ксёндз вярнуўся з Польшчы, бо калі йшлі бальшавікі, та ён кінуў касьцёл і ўцёк. Яму нічога не абходзіў касьцёл, бо трэба было яму ратаваць свой тытун, якога меў надта многа, навет прывёз 20 пудоў назад, бо там танна давалі. А цяпер усіх бальшавікамі называець, а асабліва тых, хто прызнаецца беларусамі. Ён кажа, што гэта богаадступнік і бальшавік, ды палохае жандарамі. А яшчэ ёсьць там быўшы кіраўнік маёнткамі памершага грабяга Патоцкага, нейкі Пачобут. Ен усім там кіруе, і начальнікам раёну і войтамі. Калі каго хоча ўкараць, то і ўкарае, хоць і без ніякае віны. Стаў апісываць збожжа і некаторыя, баючыся пана, хоць самі бяз хлеба, а яму збожжа паадавалі. Цяжка, цяжка нам жывецца, а яшчэ горэй жывецца жыдом.

Падарожны.

Тутэйшае жыцьце

Эндэцкая гаспадарка у Вільні.

У студню і лютым эндэцыя ў Польшчы, так у сэйме, як у дыплёмацыі, атрымала некалькі пабед (сэнат, прэзыдэнт-каталік і др.). Гэтыя пабедныя настроі хутка адазваліся і ў нас. На жаль выліліся яны ў спробах захапіць у свае рукі ўсю ўладу, усе становішчы і—завесьці так добра ведамы пад'ярэмным народам эндэцкі рэжым. Голасным рэхам у апошніх днях адазваўся па ўсей Вільні нахальны націск, зроблены ендекамі на рэктара касьцёла св. Сцефана ў Вільні, кс. Антона Зенкевіча, каб ён адрокся ня толькі ад становішча прэзэса мяйсцовага выхаваўчаха Таварыства „Пойсцёнгласць і Прэца“ (кіраўніка ахроны і варстатаў), але і ад касьцёла. Ня трэба быць нат каталікам або і хрысьціянінам, штоб разумець ўсю бязтактнасьць віленскай эндэцыі, якая адначасна мае прэтэнзыю быць прававерна-каталіцкаю арганізацыяй (любіць нат, другім закідаць брак каталіцкасьці) і разам... робіць спробы мяшацца ў чыста духоўную, прыналежную біскупу дыцэзіі, галіну жыцьця! Хто пільна прыглядаўся які дзесятак год да каталіцкага жыцьця, той ня зьдзівіцца жаданьням эндэціі. Сотні гадоў, ў той ці другой форме, польшчына трымала быццам у пахце касьцёльную палітыку, дзеля чаго толькі крыўд пацярпелі так беларусы, як ліцьвіны, ня кажучы ужо нічога аб уніятах. Гэта канечна віна не касьцёла каталіцкага, каторага міжнарадовыя прынцыпы добра нам ведамы, гэтак віна яго мясцовых прадстаўнікаў, каторыя так шкодна памяшалі боскае з людзкім, каталіцкае з польскім, што беднаму цёмнаму чалавеку магло запраўду здавацца быццам бяз польшчыны няма і праўдзівай каталіцкасьці.

Руплівасьць эндэціі каля сьв. Сцяпана маець крыху сьмешнага. Знаючы добра блізка усіх сьвядомых ксяндзоў-беларусаў, мы толькі зьдзівіліся, прачытаўшы, як „Rzeczpospolita“ дае кс. Зенкевічу назову беларуса. Кс. З. ніколі і ні адным словам ня выказаў свяей беларускасьці, не напісаў ніводнага слова да беларускіх газэт, да ніякога ня належыць таварыства. Праўда ён дагэтуль ня выступаў і варожа, толькі цяпер, дзякуючы эндэкам, мы даведаліся, што за работу ён вядзе ў Вільні. А работа гэта дрэнная, бо якжа інакш назваць абпалячываньне беларускіх і літоўскіх дзетак у польскай ахроне Т-ства?! Хай сабе эндэкі бяруць такога беларуса — нам ён не патрэбны.

Проціў беларускасьці кс. кс. Пётроўскага (прыпомніце яго працы ў „Odrodzeniu“!) і Талочкі, каторы працуе ў польскіх школах і часта аглядаецца на палякоў, мы маглі-б тож не адно закінуць.

N.

Важныя прызнаньні.

Тымчасовая Урадуючая Камісія так званае „Сярэдняе Літвы“ зрабіла вельмі цікавую пастанову аб правох краёвых языкоў. Мяйсцовымі, або краёвымі лічацца чатыры языкі: польскі, літоўскі, беларускі і жыдоўскі. У кожным з іх грамадзяне маюць права зварочвацца на пісьме (але не на словах!) да ўсіх урадовых установ, але... Але ёсьць адно такое „але“, каторае ўсю пастанову зводзіць да нуля: бо пры гэтым трэба прыкладаць пераклад на польскую мову! Такім парадкам для Эўропы паказваецца нязвычайны лібэралізм і паважаньне ўсіх моваў краю, але ў самым краю абсалютна нішто не зьмяняецца: калі маеш патрэбу да якой-колечы ўрадовай установы, дык пішы да яе па польску, а для сваей пацехі можаш да-

лучыць тое-ж самае па беларусаў, па літоўску, ці па жыдоўску!

Гэтага мала. Тымчасовая Урадуючая Камісія пастанавіла, што „ўсе плякаты, афішы і праграмы ў-ва ўсіх гэтых мовах павінны мець побач такі-ж самы тэкст, точна перакладзены на польскую мову, адзінакавы з арыгіналам як з боку разьмераў, так і тыпу шрыфту“. Кажучы славамі „Gaz. Kraj.“, гэта пастанова „жыўцом пазычана з сумнае памяці зборніку адміністрацыйных загадаў для „Сѣверо-Западнаго Края“, якія навязавалі расейскую ўрадовую мову також і ў межах прыватных адносін“. Адно толькі Т. Урадуючая Камісія забылася ўзяць з маскоўскіх законаў: тое, каб тэкст у „казённай мове стаяў на першым месцы...

Як бачым, пачынаюць для нас варочацца забытыя ўжо „добрыя старыя часы“—часы маскоўскага уціску і гвалту над мовай „інародцаў“.

Ды ня у гэтым справа, што новыя нашы „валадары“ йдуць сьледам за дзедам у адносінах да „інародцаў“, за якіх і нас, і ліцьвіноў, і жыдоў царскае правіцельства лічыла на нашай-жа роднай зямлі. А справа ў тым, што Т. Урадуючая Камісія ў сваей пастанове прызнала прад усенькім сьветам дзьве рэчы, дагэтуль пільна укрываныя. Першая—гэта тое, што ў т э о р ы і правы беларусаў, ліцьвіноў і жыдоў прызнаюцца роўнымі правом палякоў, — значыць, што гэтыя тры народы зьяўляюцца т а к і м і-ж з а к о н н ы м і г а с п а д а р а м і н а г э т а й з я м л і, за якіх дагэтуль абвяшчалі сябе выключна палякі. Другая— што г э т ы я з а к о н н ы я г а с п а д а р ы н а ш а г а к р а ю п а з б а ў л е н ы ў с я л я к а е ў л а д ы п а л я к а м і, бо—як говорыцца ў вышэй сказанай пастанове — „т ы м ч а с о в а я ў л а д а і ў р а д ы С я р э д н я е Л і т в ы ё с ь ц ь п о л ь с к і я“.

Прызнаньні гэтыя маюць нязвычайную вагу. Яны прад усей Эўропай асьвятляюць, як мае быць, фактычнае палажэньне, ўтварыўшаеся ў „Сярэдняй Ліцьве“. Яны лішні раз пацьвярджаюць, што ніякай „польскай“ Віленшчыны няма і ніколі ня было, ня гледзячы на фабрыкацыю „Цывільным Уаадам Усходніх Зямель“ статыстыкі, паводле каторай тут быццам-то ня толькі ўсе каталікі—„чыстакроўныя палякі“, але йшчэ каля дзесяцёх працэнтаў грамадзян праваслаўнае, жыдоўскаеаі і іншых вер належаць да польскае нацыянальнасьці! Яны ўрэшце павінны служыць адказам для тых, хто так дзіваваўся, чаму беларусы, ліцьвіны і жыды адмовіліся ад учасьця ў выбарах у устаноўчы Сойм „Сярэдняе Літвы“: бо ясна для ўсіх, што, калі ўлада знаходзіцца выключна у руках аднэй нацыянальнасьці, дык другія нацыянальнасьці краю могуць карыстаць з роўных правоў т о л ь к і ў т э о р ы і.

Г. Б.

× Абраная мястоваю віленскаю радаю вядомая „дэлегацыя“, якая паехала была ў Парыж прасіць аб прылучэньні Вільні і Віленшчыны да Польшчы, ужо вярнулася, даехаўшы толькі да Варшавы!

× Сёлетні Казіміраўскі кірмаш на Лукішках быў даволі слабы. Цэны вялікія, тавару ня шмат, прадуктаў зусім мала.

× **Пытаньне аб тутэйшых мовах** і афіцыяльнай мове ў Сярэдняй Ліцьве, разгледжанае ў чэцьвер Час. Урад. Камісіяй разьвязана чародным чынам: 1) Тутэйшымі мовамі Сярэдняе Літвы ёсьць польская, жыдоўская, літоўская і беларуская. 2) На кожнай з гэтых чатырох моваў насяленьне мае права зварочывацца на пісьме да ўладаў і ўстановаў Сярэдняе Літвы. 3) Дзеля таго, аднак, што часовая ўлада і ўстановы Сярэдняе Літы—польскія, наўперад да скасаваньня, калі прашэньні і дадаткі не пададзены на польскай мове, вымагаецца прыкладаць к літоўскаму, жаргоннаму ці беларускаму прашэньню пераклад іх на польскую мову. 4) Вынятак у гэтым кірунку маюць судовыя установы, дзеля якіх ёсьць спэцыяльны дэкрэт аб арганізацыі суда.

Плакаты, афішы, праграмы на ўсіх мовах павінны мець паралельны тэкст поўнага польскага перакладa, аднакавы з арыгіналам увелькі і па тыпу шрыфта.

× У Вільні 7 сакавіка адчыніліся **Літоўскія Навуковыя Курсы**. Лекцыі адбываюцца ў будынку Літоўскае гімназіі (Юраўскі, 38), ад 6—9 гадз. увечары. Выкладаньне на літоўскай мове, апрача лекцый Ф. Врублеўскага аб гаспадарсьцевым праву (папольску) і лекцый рэдактара „Нашае Думкі“ М. Гарэцкага аб беларускай літэратуры (пабеларуску).

З беларускага жыцьця.

× Н о в а я к н і г а. У Менску выйшла з друку новая кніга на беларускай мове, падручнік дзеля сярэдніх школ—„Тэорыя арытмэтыкі“. Беларускае Выдавецкае Таварыства ў Вільні робіць стараньні, каб прывезьці партыю гэтае кнігі ў Вільню.

× Б е л а р у с к і д з е я ч І г н а т о ў с к і, вядомы як прафэсар Беларускага Педагагічнага Інстытуту ў Менску і аўтар навуковае працы на беларускай мове „Гісторыя Беларусі“, цяпер на нейкі час пакінуў сваю пасаду народнага камісара земляробства у урадзе Беларускае Савецкае Рэспублікі і выехаў у Маскву, а стуль — у Самару, дзэ з часоў эвакуацыі жыве яго сям'я

× Б е л а р у с к а я В у ч ы ц е л ь с к а я С э м і н а р ы я. Ужо месяц, як у м. Барунах, Ашмянскага павету, вядуцца заняткі ў Беларускай Вучыцельскай Сэмінарыі. Вучанікоў пакуль што у 1-й і 2-й клясе разе 65 чалавек, далейшая запісь жадаючых вучыцца прыймаецца. Заявы падаюцца дырэктару сэмінарыі Сымону Раку-Міхайлоўскаму па адрэсу м. Баруны Ашмянскага павету.

× **На пункце для бежанцаў** у Вільні (Садодая вул.) цяпер знаходзіцца шмат беларусаў, паварочаных з Тамбоўскай і Самарскай губ. Беларускі Нацыянальны Камтэт, як відаць, нічога аб гэтым ня ведае.

× Надоячы прыехаў у Вільню бышы рэжысер Менскага беларускага тэатра **Ф. Аляхновіч** і ўжо пачаў арганізаваць віленскі беларускі тэатр.

Усіх асоб, якія захочуць сваей працай памагчы справе наладжаньня ў Вільні беларускага тэатру, просім сабрацца ў нядзелю 13 марца ў Беларускім клюб (Біскупская вул. 12) а гадз. 5 у веч.

× Дэлегацыя віленскіх беларусаў-каталікаў падала біскупу просьбу з сотнямі подпісаў, каб быў у Вільні касьцёл з дадаткавым набажэнствам і казаньнямі пабеларуску.

Паштовая скрынка.

Д ы к-Д з е л ю. Верш „Мужыку“ не надрукуем. З гэтага нумару будзем высылаць Вам газэту, а Вы затое часьцей прысылайце нам корэспондэнцыі аб усім, што наўкол Вас дзеецца, асабліва з пагляду беларускай сьвядомасьці. Пішэце з аднаго боку ліста паперы.

К р а ў ц о в у М а к а р у. Не забывайцеся на нас.

К а з ю к у М я д з ё л ц ы. Ці арганізавалі Вы прадаж газэты? Стварыце Нацыянальны Камітэт. Завяжыце зносіны з Бел. Нац. Кам. у Вільні, цяпер ён можа памагчы. Займіцеся пашырэньнем „Нашае Думкі“ сярод вясковага насяленьня. Пішыце аб усім чыста кожны тыдзень.

М. Г у с а к у. Дзякуем за прысланы матар'ял. Пішыце нам кожны тыдзень. Прышліце адрэсы знаёмых Вам беларускіх людзей для высылкі ім пробных нумароў „Нашае Думкі“.

М а к о ў с к а м у. За кожны дастаўлены ў рэдакцыю нумар „Савецкае Беларусі“ заплоцім сотню і болей польскіх марак. Пастарайцеся дастаць ня толькі „Звезду“ і „Белорусскую деревню“, але таксама смаленскія, віцебскія, магілеўскія і інш. газэты.

М. Р ы м а ш э ў с к а м у. Можна раздаваць дарма.

ІНФОРМАЦЫЙНЫ АДДЗЕЛ.

Б і б л і а т э к а Б е л а р у с к а г а Н а в у к о в а г а Т-в а будзе адчынена дзеля карыстаньня на месцы для навуковых мэт ў памяшчэньні Т-ва пры Вострабрамскай вул. № 9.

Б е л а р у с к а е В ы д а в е ц к а е Т-в а выдае ўсялякія кніжкі ў беларускай мове. Сябраў прынімае Урад Т-ва. Уступная плата — 50 м., сяброўская гадавая складка — 100 м. Адрэс Т-ва: Віленская вул. № 33, кв. 1 (адчынена ад 4 да 5 гадз. у дзень).

Б і б л і а т э к а б. „З н а н і е“ мае багаты выбар кніжак да чытаньня ў розных мовах. Адчынена: 10—1 і 3—6 гадз. Адрэс: Віленская 33.

Б е л а р у с к а я К н і г а р н я „Беларускага Выдавецкага Т-ва“ мае на прадажы ўсе беларускія кніжкі. Адрэс: Завальная 7.

Б е л а р у с к і Н а ц ы я н а л ь н ы К а м і т э т месьціцца ў Вільні, Вострабрамская, 9, пакой № 5. Старшыня Ф. Ярэміч, Робіцца рэгістрацыя беларусаў даецца духоўная і матар'яльная помач

1-я В і л е н с к а я Б е л а р у с к а я Г і м н а з і я месьціцца на Вострабрамскай вул., 9. Дырэктар М. Кахановіч, інспэктар А. Дмахоўскі.

Б е л а р у с к і я п а ч а т к о в ы я ш к о л ы ў В і л ь н і. 1) Кальварыйская, 73; 2) Лідзкі тракт, могільнік; 3) Радунская, 27-а; 4) Зарэчча, Панамарская, 12. Навука бясплатная. У кожнай школе даецца дзяцём сьнеданьне.

Б е л а р у с к і Ш к о л ь н ы А д д з е л. Вільня, Каўкаская вуліца (рог Вялікай Пагулянкі), 2, другі паверх, налева, пакой № 13.

Б е л а р у с к і В у ч ы ц е л ь с к і С а ю з Канцэл. 1-й Віленскай Беларускай Гімн

П р ы т у л а к К а м і т э т а П о м а ч ы Вострабрамская, 9 (будынак гімназіі). Загадчыца Л. Васілевіч.

В і л е н с к і С а ю з К о о п э р а т ы в а ў Малая Погулянка, дом № 12

К о о п э р а т ы ў „Р а й н і ц а“ ў Вільні. Вялікая Пагулянка, 17.

К о о п э р а т ы ў н а я д р у к а р н я „Д р у к“, Вільня, Вострабрамская, 5 (Пасаж). Там-жа Беларускае Выдавецтва У. Знамяроўскага.

Ю р ы д ы ч н а я с э к ц ы я пры Віленскім беларускім Нацыянальным Камітэце месьціцца на Вострабрамскай вул. № 9.

Сэкцыя адчынена ад 11 да 2 гадзіны у дзень. Прыймаецца складаньне просьб і заяў у беларускай і польскай мове і кіраваньне іншымі юрыдычнымі справамі. Бедным беларусам—рада дарма. Дзеля працы ў сэкцыі запрошаны спрактыкаваныя юрысты.

Б е л а р у с к і К л ю б ў В і л ь н і. Біскупская, 12.

Л і т о ў с к а я п о л і к л і н і к а. (Віленская вул. проці Дабрачын. зав.) прыймае хворых ў аддзяленьнях: хірургічных хвароб, унутраных, на вочы, акушэрства і гінеколёгіі. Пользу даюць адмысловцы за самую невялічкую плату.

Рэдактар-Выдавец М. ГАРЭЦКІ Кооп. Друкарня „ДРУК“, Вострабрамская, 5.